Абвяшчаецца перапынак на дзесяць хвілін.

**Старшыня.** Таварышы, спрэчкі скончаны. Заключнае слова мае тав. Кнорын. (Доўгія воплескі).

**Кнорын.** Таварышы, спрэчкі па дакладу Цэнтральнага Камітэту на нашым зьезьдзе з самых першых выступленьняў увайшлі у рэ-

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

чышча дзелавога абгаварэньня пытаньняў, якія стаяць перад намі. Пры гэтым сярод членаў зьезду ня выявілася якіх-бы та ні было прынцыповых разгалосьсяў. Калі мы мелі разгалосьсі, то толькі з повяду паасобных канкрэтных фактаў нашае дзелавое, практычнае, савецкае, гаспадарчае, партыйнае працы за справаздачны пэрыяд. Гэта дае мне, таварышы, поўнае права сказаць, што мы ўсе аднолькава падыходзім да ацэнкі нашых посьпехаў і нашых недахопаў.

Гэта палягчае маю задачу,—задачу дакладчыка, у заключным слове. Таму я спынюся толькі на шэрагу запісак, якія мне былі паданы, і на некаторых асноўных пытаньнях, узьнятых у спрэчках таварышамі. Я лічу, што значная частка з тых пытаньняў, якія тут былі пастаўлены, павінны быць вырашаны адпаведнымі партыйнымі, савецкімі, прафэсыянальнымі і інш. органамі ў практычнай, дзелавой працы. Гэта дасьць большую карысьць і паслужыць тэй мэце, з якою, мне здаецца, гэтыя пытаньні задаваліся.

Раней за ўсё, я адкажу на шэраг канкрэтных запытаньняў, пастаўленых мне ў запісках, і на некаторыя сумненьні некаторых членаў нашага зьезду.

«У якім процанце дзяржаўныя і каапэрацыйныя органы абхапляюць сялянскі збыт, у прыватнасьці, па мясе і сене?»—Паводле даведкі, якую мне далі, дзяржаўныя і каапэрацыйныя гандлёвыя органы абхаплялі сялянскі збыт па мясе: у мінулым годзе на 25 проц., а ў гэтым годзе на 35 проц. Збыт сена не рэгуляваўся органамі Наркамгандлю.

Другое пытаньне: «Колькі процантаў сярэдняга і вышэйшага камскладу зьяўляецца членамі партыі і камсамолу?»—Паводле даведкі, якую мне далі,—у камскладзе 56 проц. членаў партыі і 4 проц. камсамольцаў.

У некаторых таварышоў выклікалі сумненьні тыя лічбы, якія я даваў аб наяўнасьці хлебных запасаў па засеўных групах. Я праверыў яшчэ раз гэтыя даныя нашае статыстычнае ўправы і магу пацьвердзіць толькі тыя лічбы, якія я ўжо падаваў. Таварышоў непакоіць тая акалічнасьць, што 25-26 проц. бяднейшых сялянскіх гаспадарак маюць 19 проц. хлебных запасаў. Для таго, каб ацаніць гэту лічбу, трэба яе параўнаць з колькасьцю запасаў у вышэйшых групах, тады мы знойдзем, што запасы бяднейшых груп улетку былі, прыкладна, у 3—4 разы менш запасаў заможных груп. Мне здаецца, што гэта і ёсьць сапраўдныя суадносіны хлебных запасаў у нашай сялянскай гаспадарцы. Пры гэтым, зразумела, трэба мець на ўвазе, што ўсе нашы сялянскія гаспадаркі ў асноўным зьяўляюцца спажывецкімі гаспадаркамі, што мы завозім хлеб з самае восені і з кожным годам завозім яго ўсё больш. І ў гэты час, у прыватнасьці, мы ўжо маем досыць высокую месячную лічбу завозу хлеба за апошнія месяцы, большую, чым у мінулым годзе. У нас вялікіх хлебных запасаў няма і нават у заможных гаспадарках—хлеб толькі да новага ўраджая.

Я карыстаюся выпадкам зазначыць, што небясьпекі сур'ёзных цяжкасьцяй на нашым хлебным рынку няма. Канечна, могуць быць паасобныя цяжкаватыя моманты пры завозе, бо вялікую колькасьць хлеба для нашых патрэб прыходзіцца завозіць.

Наступнае пятае пытаньне: «чаму па паасобных арганізацыях, у прыватнасьці, па Барысаўскай, малы прыцёк у партыю, і якую працу ў далейшым мы будзем весьці для ўзмацненьня прыцёку ў шэрагі нашай партыі?»—Наогул, на пытаньні аб прыёме ў партыю я спынюся ў канцы майго заключнага слова. Зараз я павінен сказаць толькі адно, што прычынамі невыстарчальнага росту цэлага шэрагу нашых арганізацый, акрамя аб'ектыўных, зьяўляецца, бязумоўна, і тая акалічнасьць,

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

што шэраг арганізацый не зьвярнуў належнае ўвагі на ўцягваньне новых кадраў рабочых у партыю. Тая акалічнасьць, што зараз зразу мы прынялі вялікую масу рабочых у шэрагі нашай партыі, зразумела, таксама не зьяўляецца выпадковай; яна зьяўляецца ў некаторай ступені вынікам таго, што ў нас штодзенная праца па ўцягваньні ў шэрагі партыі невыстарчальная. Па Барысаўскай арганізацыі прынята з ліпеня па кастрычнік 21 чалавек, а за апошнія два тыдні 210 чалавек, г. зн. у 10 раз больш. Апошняе добра, але першае кепска.

Наступнае шостае пытаньне: «Чаму ў Беларусі не праводзіцца палажэньне аб правох райвыканкомаў і сельсаветаў?»—Палажэньне гэтае распрацована ЦКК-РСІ і знаходзіцца на абмеркаваньні адпаведных савецкіх органаў. Тая акалічнасьць, што гэтае палажэньне датычыць цэлага шэрагу ведамстваў, цэлага шэрагу ўстаноў, ускладняе працу і таму яно праходзіць параўнальна павольна.

Наступнае пытаньне: «ці была апазыцыя ў складзе ЦК нашай КП(б)Б?»—Я павінен адказаць, што такой у ЦК кампартыі Беларусі не аказалася. Сярод членаў акруговых камітэтаў аказаўся, здаецца, 1 апазыцыянэр. Больш ня было.

«Ці былі апазыцыянэры ў камскладзе БВА?» Дакладнай лічбы па камскладзе я не магу даць, але па ўсёй партарганізацыі вайсковае акругі было 15 апазыцыянэраў.

Наступнае пытаньне: «ці будуць будаваць шкляны мэханізаваны завод у Беларусі, г. зн. у Бабруйску, аб якім былі чуткі?»—Адкажу: пабудаваньне шкляннога мэханізаванага заводу ўключана ў 5-цігадовы плян, дзе ён будзе пабудаваны, гэта абгаворым.

«Ці вывозяць лес за граніцу?»—Вось даведка, якая мне дадзена: лес за граніцу вывозіцца, прыкладам, на суму 2 з пал. мільёну рублёў у год.

Наступнае пытаньне: «якія прымаюцца меры ў сэнсе ўдасканаленьня лесаапрацоўчае справы?»—Бабруйскі камбінат—гэта ёсьць буйнейшая справа ў сэнсе палепшаньня справы лесаапрацоўкі.

Абразіліся на мяне чыгуначнікі, кажуць, што я не ўспамінаў аб чыгуначніках. Я думаю, што пытаньне аб працы партарганізацыі, пытаньне аб агульным росьце эканомікі нашай краіны—гэта пытаньні, якія датычаць усіх нашых арганізацый, усіх членаў нашай партыі, у тым ліку і чыгуначнікаў.

«Ці займаўся ЦК спэцыяльна пытаньнем чыгуначнага транспарту?».

Займаўся. Быў пастаўлен шэраг паасобных пытаньняў аб заработнай плаце грузчыкаў, аб партыйнай працы на транспарце—апошняе пытаньне яшчэ ня ў поўнай меры закончанае.

Была пададзена запіска—я ня прывёў лічбаў аб вылучэньні.

Мы маглі-б прывесьці даволі значныя лічбы аб вылучэньні нізавых працаўнікоў на партыйную і іншую працу. Было вылучана на нізавую працу членаў партыі 78 чалавек, беспартыйных—27 чалавек. Я думаю, што гэтыя лічбы вылучэньня далёка не абхапляюць усіх тых, якія сапраўды вылучаны.

Наступнае пытаньне—аб страхаваньні. Таварыш гаворыць, што ЦК правільна націснуў таксама і на тое, каб своечасова выплачвалася заработная плата, што патрэбна націснуць таксама і на тое, каб своечасова ўносіліся гаспадарчымі органамі страховыя ўзносы.

Я павінен сказаць, што ЦК вельмі цьвёрда і вельмі рашуча даў паказаньні адпаведнай групе гаспадарчых працаўнікоў. Я ня маю цяпер яшчэ выстарчальных падстаў гаварыць, што гэтыя паказаньні выкананы, але сёе-тое, як відаць, выканана. Калі дырэктыва ЦК у гэтых адносінах ня была выканана, то трэба націснуць, каб яна была выкана-

на. Хацелася-б зрабіць так, каб не паўтараць паказаньняў. Але што-ж, калі гэтага не хапае, мы згодны паўтарыць. (**Тав. Карп: «Выканана»**).

Давайце спынімся на тым, што ў гэтых адносінах павінна быць праведзена праверка. Тав. Карп будзе мець магчымасьць па дакладу ЦКК, які таксама, як відаць, гэтае пытаньне адзначыць, выступіць і сказаць, што імена выканана.

Вось, таварышы, асноўныя запіскі, на якія мне неабходна было адказаць.

Цяпер дазвольце мне перайсьці да некаторых пытаньняў, якія былі пастаўлены ў спрэчках.

Я рад адзначыць тую акалічнасьць, што значная частка спрэчак круцілася вакол пытаньняў нашае гаспадаркі. Гэта зусім правільна. Гаспадарчае будаўніцтва зьяўляецца асновай усяго нашага будаўніцтва, і зусім натуральна, што па справаздачы ЦК, раней за ўсё, партыйны зьезд пытае ЦК, што зроблена ў гэтай галіне, якія недахопы маюцца ў гэтай галіне, як мы расьцём, таму што на аснове гаспадарчага росту ідзе і ўвесь іншы наш рост.

Якія пытаньні былі пастаўлены таварышамі? Аб нашым будаўніцтве, аб каапэраваньні, аб разьвіцьці і інтэсыфікацыі нашай сялянскай гаспадаркі, аб бюракратызьме ў цэлым шэрагу нашых гаспадарчых апаратаў, аб самай ролі гаспадарчай працы ва ўсёй нашай працы.

Я на гэтыя пытаньні, заданыя тут членамі нашага зьезду, пастараюся адказаць.

У галіне нашага будаўніцтва. Пляны будаўніцтва вам вядомы. Шэраг таварышоў, падаўшых запіскі, асабліва спыняюцца на тым, што мы не павінны абмяжавацца будаўніцтвам прамысловасьці для скарыстаньня нашага ўнутранога с.-г. сырцу, а павінны ставіць пытаньне аб будаўніцтве сапраўднай цяжкай індустрыі.

Таварышы, усякі з нас павінен ставіць перад сабою рэальныя задачы. Толькі той, хто ставіць перад сабой рэальныя задачы, будзе мець посьпех. Пытаньні аб пабудаваньні мэталюргічнага заводу, чыгуна-ліцейнага і іншае цяжкае індустрыі наўрад ці сваячасовы ў нашых умовах. Наша задача ў першую чаргу, як я ўжо сказаў у маім дакладзе,—сканцэнтраваць увагу на стварэньні прамысловасьці, якая апіраецца на наш мясцовы сырэц, і дадаткова—на ўвозны сырэц. Я думаю, што гэта задача—важнейшая палітычная задача для нас, якую мы асабліва павінны падкрэсьліць. Мы працуем не асобна ад Савецкага Саюзу. Індустрыяльны рост Савецкага Саюзу зьяўляецца нашым ростам. Нельга разглядаць, няправільна было-б ставіць пытаньне так, што кожны раён, кожная савецкая рэспубліка павінна індустрыялізавацца аднолькава. На тое і Савецкі Саюз, на тое і падзел працы між асобнымі савецкімі рэспублікамі, каб кожны ўздымаў тое, што больш адпавядае ўнутраным сілам і гаспадарчым магчымасьцям кожнага, а ўсе разам, у цэлым, складуць адзіную савецкую індустрыю, адзіную сацыялістычную індустрыю. Пры разгорнутай савецкай уладзе, пры разгорнутым сацыялістычным будаўніцтве зусім ня трэба, каб у кожным раёне будаўніцтва сацыялізму адбывалася асобна. Будаўніцтва сацыялізму ва ўсім Саюзе не залежыць ад індустрыі кожнай рэспублікі, а залежыць ад індустрыі ўсяго Савецкага Саюзу.

Аб каапэраваньні. Таварышамі зусім правільна пастаўлена пытаньне аб каапэраваньні сялянскага збыту. Я думаю, што з асаблівай сілай трэба падкрэсьліць гэтыя пытаньні.

Гэта важная ў нас задача сацыялістычнага будаўніцтва стаіць перад намі. Толькі тады, калі асноўная сялянская прадукцыя пойдзе на рынак праз нашыя рукі, праз нашыя дзяржаўныя і гандлёвыя органы, праз нашыя каапэрацыйныя органы, толькі тады мы будзем у на-

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

лежнай меры мець уплыў на гаспадарчае разьвіцьцё нашай вёскі. Толькі тады, калі асноўную прадукцыю, якая закупляецца сялянскаю гаспадаркаю, будуць даваць нашы гандлёвыя і каапэрацыйныя органы,—толькі тады мы будзем мець у нашых руках ў гаспадарчых адносінах усю сялянскую масу. І я лічу тут неабходным падкрэсьліць, што ў гэтай галіне перад намі яшчэ цяжкія і важныя задачы, што тут наша праца яшчэ ў самым пачатку.

Трэцяе пытаньне—аб разьвіцьці працаёмкіх культур, індустрыялізацыі сельскай гаспадаркі і г. д. Гэтае пытаньне было пастаўлена тав. Стасевічам і падкрэсьлена цэлым шэрагам таварышоў, якія выступалі ў спрэчках. Пытаньне важнае. Ва ўсіх нашых плянах, ва ўсіх нашых рэзалюцыях мы гаворым аб інтэнсыфікацыі нашае сельскае гаспадаркі. Я павінен падкрэсьліць тут яшчэ адну толькі ўмову, што пры такім росьце прамысловасьці, які мы маем, пытаньне аб працаёмкіх культурах у вёсцы, пытаньне аб рэарганізацыі сялянскай вытворчасьці ў такім напрамку, каб яно спажывала ў сябе больш працы, разьвівала таварную частку сваёй прадукцыі, зьяўляецца найважнейшым пытаньнем нашага разьвіцьця. І на гэты бок, натуральна, мы ўсе павінны зьвярнуць сур'ёзную ўвагу. Мы ўсюды гаворым, што гэта справа надзвычайна важная—справа паглыненьня лішняй рабочай сілы нашай вёскі, што паслабляе наша сельска-гаспадарчае перанаселеньне,—што яна будзе карыстацца поўным і выстарчальным посьпехам толькі пры роўналежным адпаведным разьвіцьці нашай прамысловасьці па апрацоўцы сельска-гаспадарчага сырцу.

Чацьвертае пытаньне—рэгуляваньне рынку. Большасьць таварышоў спыняліся на гэтым пытаньні, большасьць паказвала тут на шэраг буйнейшых недахопаў. Зусім правільна, я згодзен з большай часткай выступаўшых, з усімі дзелавымі заявамі ў гэтым напрамку. Тут у нас яшчэ шмат недахопаў. І тое, што гэтыя недахопы няўхільна павінны былі мець месца, зусім ясна вынікала з тых даных, якія я пералічыў у сваёй справаздачы. Я думаю, што ў далейшым на гэту справу павінна быць зьвернута сур'ёзная ўвага. Зразумела, гэта трудная справа, якая патрабуе капіталаў, якіх у нас няма, але крок за крокам мы будзем пасоўвацца ў гэтым напрамку ўперад. Як ва ўсялякай справе, дзе нашы сілы яшчэ слабыя, у нас тут будзе шэраг буйных недахопаў. Але толькі праз перамогу гэтых недахопаў мы будзем пасоўвацца наперад да далейшых посьпехаў.

Пятае пытаньне—аб бюракратызьме. Шэраг таварышоў заяўляюць, што гаспадарчыя органы не прапрацоўваюць пытаньняў зьнізу, у прыватнасьці, паказваюць на Лесбел, а—зьверху, мэханічна, без падліку мясцовых асаблівасьцяй праводзяць свае прапановы. Я ня меў магчымасьці праверыць, наколькі гэтыя заявы ўгрунтованы. Відавочна на процантаў 70, прынамсі, яны маюць глебу пад сабою. Я павінен сказаць, што такія факты зусім натуральныя пры тэй характарыстыцы складу працаўнікоў, якая тут была дадзена па шэрагу гаспадарчых органаў. Зусім натуральна, што ЦК і нашым вышэйшым гаспадарчым органам прыдзецца ўзяць усё гэта пад увагу і кіравацца гэтым. Неабходна настойліва імкнуцца да таго, каб усё большая і большая колькасьць гаспадарчых пытаньняў былі распрацованы нізавымі органамі, каб нізавыя органы, вытворчыя нарады бралі ўдзел у распрацоўцы цэлага шэрагу важнейшых пытаньняў нашага гаспадарчага будаўніцтва.

Шостае пытаньне—аб нашай лясной прамысловасьці. Наша лясная прамысловасьць грае буйнейшую ролю ў жыцьці ня толькі прамысловага сэктару нашае народнае гаспадаркі, але і ў агульным гаспадарчым сэктары. Гэта паказвае тая лічба, якую я прывёў у дакладзе: звыш 40 проц. усіх дадатковых прыработкаў да сялянскае гаспадаркі

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ідзе ад лясное прамысловасьці, ад перавозкі, а перавозка ў большасьці выпадкаў—ад лясное прамысловасьці. Для нашае сялянскае гаспадаркі і для нашай прамысловасьці лясная прамысловасьць грае вялізарнейшую ролю. Таму наша ўвага да лясное прамысловасьці павінна быць згуртавана ў максымальнай меры. Лясная прамысловасьць—адна з асноўных камандных вышынь, у нашай прамысловасьці, у нашай народнай гаспадарцы наогул.

Таму паказаньні, якія тут былі зроблены, маюць вялікае значэньне. З імі зьвязана пытаньне аб складзе працаўнікоў. Тут паказвалася на тое, што нізавы склад ня наш, не савецкі склад, што спэцы ня могуць праводзіць клясавай палітыкі, хоць-бы ў такіх пытаньнях, як уцягненьне ў перавозку пэўных груп сялян і інш. Я згодзен з гэтым, але мясцовыя арганізацыі павінны рашучым чынам паставіць пытаньне, каб гэтая лінія—пасылка на дадатковы заработак тых груп сялян, якія больш усяго ў ім зацікаўлены—гэта значыць беднату.

Я думаю, што ўсе нашы гаспадарчыя органы будуць кіравацца тым, каб гэта лінія была выканана ў максымальнай меры, наколькі дазваляюць магчымасьці і абставіны гаспадарчай работы. З другога боку, неабходна зьвярнуць сур'ёзную ўвагу на склад працаўнікоў, на падбор і праверку новага складу працаўнікоў, перш за ўсё, у нашай лясной арганізацыі, якая бліжэй усяго мае дачыненьне да самых шырокіх сялянскіх мас. Нашым партыйным арганізацыям зьнізу да верху прыдзецца зьвярнуць сур'ёзную увагу на ўкараненьне ў гэтай працы новых сіл, новых людзей, больш пралетарскіх, не старых спэцаў (а працуюць у большасьці выпадкаў старыя спэцы і старыя гаспадарнікі). Гэта задача павінна застацца перад намі.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Заканчваючы свой даклад па гаспадарчых пытаньнях, я павінен падкрэсьліць надзвычайна вялікую важнасьць гаспадарчай працы ў нашых умовах. Надзвычайна вялікую адказную ролю гаспадарчых працаўнікоў у справе нашага сацыялістычнага будаўніцтва таксама трэба падкрэсьліць, таму што гэта праца зьяўляецца аднэй з самых трудных прац у нашых умовах і павінна карыстацца максымальнай увагай з боку кожнага партыйца. Бяз гэтага ў нас руху наперад няма.

Але трэба яшчэ раз падкрэсьліць і тое, што я сказаў па пытаньні аб разьвіцьці эканамічнай думкі членаў партыі. Мне адзін таварыш падаў тут запіску аб тым, што вось не зьмясьцілі яго артыкул і якая пасьля гэтага можа быць ахвота ў членаў партыі да эканамічных пытаньняў.

Гэтаму таварышу я павінен сказаць, што яго артыкул выкарыстоўваецца, з ім знаёмяцца ня толькі адны рэдактары. Мне далі даведку, што шэраг пытаньняў, пастаўленых у гэтым артыкуле, можа быць выкарыстаны для агульных эканамічных плянаў. Але я зараз гэтай запіскай карыстаюся для таго, каб сказаць, што было-б надзвычайна шкодна, калі-б той ці іншы член партыі, што напісаў артыкул, у якім выказаў тую ці іншую эканамічную думку, але які (артыкул) па тых ці іншых прычынах ня быў надрукован адразу, перастае цікавіцца гэтымі пытаньнямі. Такая, я-б сказаў, драбязьлівасьць, абразьлівасьць, гавораць пра некаторыя нясур'ёзныя адносіны да справы. Тут гутарка ідзе не аб артыкуле, і менш за ўсё аб артыкуле, артыкул гэта нешта другараднае. Нам трэба дабіцца, таго, каб шырокія масы нашае партыі сапраўды цікавіліся шляхамі нашага эканамічнага разьвіцьця, нашымі дасягненьнямі, нашымі недахопамі, каб яны больш крытыкавалі, давалі больш сур'ёзнай дзелавой крытыкі. Вось што нам зараз трэба. Адным з нашых сур'ёзных недахопаў зьяўляецца недахоп крытыкі. Нам патрэбна больш дзелавая крытыка, зразумела, не дэмагагічная крытыка. На-

конт дэмагогii на зьезьдзе я сумняваюся. (**Тав. Шукевiч:** «На зьезьдзе неабходна»).

Тав. Шукевiч, калi ўсе змарылiся i ня хочуць слухаць, тады, зразумела, некаторая дэмагогiя патрэбна i, зразумела, вашы выступленьнi змогуць падтрымаць настрой.

Пераходжу да другое групы пытаньняў, да пытаньняў культурнага будаўнiцтва.

Таварышы, што выступалi тут па маiм дакладзе, даказваюць з поўнай яснасьцю, што ў галiне культурнага i эканамiчнага будаўнiцтва мы ўвайшлi ўжо ў новую стадыю. На чым мы ўчора i сёньня завастрылi пытаньне? Не на агульных пытаньнях аб прынцыпах нашага культурнага будаўнiцтва, не на агульных тэмах, а на шэрагу дробных, дзелавых, але важнейшых для нас пытаньняў, пры чым ва ўсiх спрэчках былi высунуты найбольш масавыя формы нашае культурнае працы. Якiя пытаньнi тут ставiлiся? Аб радыё, аб кiно, аб масавай лiтаратуры, аб масавай культурнай працы, аб моладзi, аб пiянэрах. Гэта найбольш масавыя нiзавыя формы нашае працы. Я лiчу, што гэта зьяўляецца буйнейшым дасягненьнем нашай працы, калi мы падышлi да такiх дробязяй, праз якiя на справе i iдзе культурная рэвалюцыя ў нашай краiне. Культурная рэвалюцыя ў нашай краiне iдзе не праз вярхi, не праз пастаноўку вышэйшых праблем, а праз пераварочваньне мазгоў на самым нiзе, праз зьмену самой базы на фабрыцы, на заводзе i ў вёсцы. Вось чаму ўсе гэтыя пытаньнi атрымлiваюць буйнейшае значэньне. Зразумела, тут у нас яшчэ вельмi i вельмi шмат недахопаў. Я думаю, што мне можна па цэлым шэрагу гэтых пытаньняў не гаварыць. Я магу адаслаць таварышоў да апошняга выступленьня тав. Бухарына на Ленiнградзкай партканфэрэнцыi, але павiнен сказаць адно, што сканцэнтраваць увагу зараз на працы на ўзьняцьцi культурнага ўзроўню ўсяе масы рабочае клясы i сялянства, усяе масы членаў нашае партыi,—гэта важнейшая задача, якая стаiць перад намi. Радыё зьяўляецца надзвычайна моцным рухаючым сродкам, якi робiць уплыў на самыя шырокiя масы. Таксама i кiно.

Недарма Ўладзiмер Iльлiч сказаў, што кiно зьяўляецца самым патрэбным мастацтвам у сучасны момант. Яно ахоплiвае найбольш шырокiя масы мацней чым тэатр; таму на гэта пытаньне нашае практычнае дзелавое працы нам неабходна зьвярнуць асаблiвую ўвагу. Кiно мае ўсе магчымасьцi для сур'ёзнага разьвiцьця, але пакуль яно ахоплiвае параўнаўча невялiкае кола рабочае клясы. У нас яшчэ ня зусiм добра пастаўлена гэта справа. Зьмест карцiн далёка не адпавядае нашым патрабаваньням. Тут бяда ў тым, што мы апiраемся на старыя, ня нашыя, некамунiстычныя кадры, бо i кiно, i новы тэатр могуць выпрацавацца толькi ў працягу дзесяцiгодзьдзяў, што традыцыi мiнулага яшчэ жывыя. Мы павiнны паставiць задачу аб палепшаньнi кiно-прадукцыi i мы гэту задачу перад сабою ставiм i павiнны будзем яшчэ больш нацiснуць на гэтую справу. Стварэньне новай кiно-прадукцыi патрабуе вялiзарных сродкаў, якiх мы ўлажыць у гэту справу зараз ня можам. Павiнен сказаць, што з боку нашага ЦК, а таксама з боку ЦК УсеКП(б), адпаведная ўвага да гэтай важнейшай i патрэбнейшай справы ёсьць. Цяпер трэба арганiзаваць грамадзкую думку самых шырокiх мас у адносiнах да гэтай прадукцыi. Трэба, каб карцiна ня проста падносiлася, трэба, каб шырокiя масы выказвалi аб ёй сваю думку, трэба арганiзаваць вакол гэтай справы рабоча-сялянскую крытыку, рабоча-сялянскую грамадзкасьць, гэта ёсьць асноўны шлях да ўзьняцьця гэтай важнейшай галiны працы, да ўзьняцьця культуры шырокiх працоўных мас.

ПРЭЗIДЭНЦКАЯ БIБЛIЯТЭКА РЭСПУБЛIКI БЕЛАРУСЬ

Масавая літаратура. Мы павінны сказаць, што ў сэнсе масавай літаратуры ў нас справа з рук вон дрэнная. Добрых масавых кніг у нас няма. Кніжкі або цяжкія, або напісаны настолькі сусальна, настолькі не адпавядаюць вырасшым патрэбнасьцям рабочых і сялян, што яны ўжо гэтыя спэцыяльныя выданьні для рабочых чытаць ня могуць, бо ў іх усё так абкарнана, усё ў такой форме паднесена, што сапраўды ад іх робіцца млосна. Тут цяжэйшая задача стаіць перад намі, але ў гэтай справе нам трэба выпрацаваць нашага аўтара, папулярызатара, які даў-бы цэлы шэраг тэм як палітычных, так і культурных і эканамічных. У гэтай галіне намі яшчэ ня многа зроблена, а гэта задача не малаважная і можа быць больш трудная, чым задача вылучэньня бэлетрыстых.

У гэтай-жа сувязі стаіць пытаньне з выхаваньнем моладзі. Нашыя партарганізацыі, павінен сказаць, невыстарчальна зьвяртаюць увагу на справу выхаваньня шырокіх мас моладзі. Камсамол часта працуе сам па сабе, на сваю рызыку і страх. І калі праца ў камсамоле параўнаўча добра пастаўлена, дык гэта трэба аднесьці за кошт энэргічнай самадзейнасьці кіруючых кадраў камсамолу. Наша партыя толькі зьверху, так сказаць, крыху прыкранаецца да гэтай працы ў сэнсе кантролю, у сэнсе праверкі, у сэнсе недапушчэньня ў камсамоле якіх-небудзь ляпсусаў. На гэта мы больш глядзім, а каб мы ўдзельнічалі ва ўсёй культурнай працы камсамолу, гэтага сказаць нельга. Мне здаецца, што зараз паставіць гэту задачу і што-небудзь зрабіць у сэнсе дапамогі, сур'ёзнай дзелавой практычнай дапамогі камсамолу—было-б вялізным крокам наперад.

Канчаючы раздзел аб культуры, я павінен спыніцца на пытаньні аб антысэмітызьме і інш. недахопах, на якіх тут спыняўся шэраг таварышоў. Чаму я стаўлю гэта пытаньне ў зьвязку з пытаньнямі культуры? Таму, што асноўная прычына таго, што гэта зьявішча мае месца, я, у разрэз з заявою т. Перапечкі, скажу, што гэта зьявішча расьце. У чым асноўная прычына гэтага? У вялізнай някультурнасьці шырокіх мас рабочых. Як мы можам змагацца з антысэмітызмам, з п'янкай, з бойкамі на прадпрыемствах, з бойкамі нават у нашых клюбах, з хуліганствам, якое мае месца ў нашых клюбах? Толькі шляхам падняцьця сур'ёзнай глыбокай культурнай працы. Тут у працягу 1—2 дзён нічога ня зробіш. Патрэбна доўгая праца. Гэта ёсьць адна з задач тэй культурнай рэвалюцыі, якая павінна быць праароблена ў шырокіх масах рабочых і сялян,—толькі так мы справімся з гэтай задачай. Зараз-жа замазваць пытаньне аб тым, што антысэмітызм ня мае месца, было-б вельмі шкоднай і небясьпечнай для нас справай.

Мы бачым, што антысэмітызм пашыраецца ў рабочых масах, ня толькі ў нас, у БССР, але і ў Маскве, і ў Ленінградзе, і ў цэлым шэрагу іншых месц.

На якой глебе ён ўзьнімаецца? На глебе нашай малой культурнасьці, нашай гаспадарчай адсталасьці, на глебе нашых гаспадарчых цяжкасьцяй, у цэлым шэрагу выпадкаў на глебе таго, што мы наперад рухацца можам параўнаўча павольна і тут вось вылязае старое і спрабуе каго-ні-каго адарваць ад савецкае ўлады.

Антысэмітызм носіць антысавецкі характар. Тут справа не ў рэлігійных звычаях, як адна з работніц фабрыкі «Дзьвіна» зараз гаварыла. Рэлігійныя звычаі—гэта рэч другарадная. Я гавару аб сутнасьці антысэмітызму. Але вось у чым бяда,—у тым, што гэты антысэмітызм, на гэтай-жа самай фабрыцы, аб якой учора гаварыла гэта работніца (я ёй больш давяраю, чым агалошанаму мною ў дакладзе лісту), ён ёсьць у быце, як непавага, як ганебныя адносіны да асоб другіх нацыяналь-

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы